паловы XIX – пачатку XX ст.[1] У сваіх даследаваннях ён непасрэдна закранае пытанне «нашаніўства» і мяркуе, што «краёвасць» была свайго роду альтэрнатывай таму грамадска-палітычнаму выбару, які зрабіла «Наша Ніва».

Падсумоўваючы, належыць зазначыць, што ў беларускай гістарычнай навуцы яшчэ канчаткова не выпрацаваны крытэрыі ацэнкі «Гомона», «Нашай Нівы» і ідэалогіі беларускага руху, а значыць, ідзе працэс асэнсавання ўплыву выданняў на станаўленне беларускай дзяржаўнасці ў XX ст.

Такім чынам, адзначаючы безумоўныя дасягненні гістарыяграфічнага арсенала большасці паднятых пытанняў, нельга не звярнуць увагу на тое, што па сваёй якасці розныя перыяды, як і розныя тэмы, прыкметна адрозніваліся адзін ад аднаго. Акрамя станоўчага вопыту асваення праблемнага поля палітычнай гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст., існавалі і працэсы, што яго тармазілі і стваралі лакуны ў вывучэнні тых ці іншых аспектаў праз кан'юнктурна-ідэалагічныя і метадалагічныя канцэпты. Таму на новым этапе развіцця гістарычнай навукі мэтазгодна зноў звярнуцца да аналізу вызначаных праблем, выкарыстоўваючы новыя метадалагічныя падыходы, новыя крыніцы, пераасэнсоўваючы рэальны кагнітыўны патэнцыял ужо вядомых, напаўняючы палітычныя падзеі гучаннем з іншай танальнасцю і свежай інтэрпрэтацыяй. Напрыклад, у кантэксце гісторыка-антрапалагічнага падыходу надаць палітычным рэаліям так званы «ачалавечаны вобраз» праз паказ адносін, матывацый грамадска-палітычнай актыўнасці або пасіўнасці насельніцтва беларуска-літоўскіх губерняў. Тым самым парушыць традыцыйную схему ўспрыняцця падзей у рэгіёне толькі як ланцужковую рэакцыю і копію таго, што адбывалася ў цэнтрах (Пецярбург, Вільня, Варшава), падымаючы на паверхню спецыфіку рэгіянальнага палітычнага жыцця.

## 1.2. Крыніцы

Як паказвае практыка, палітычная гісторыя выкарыстоўвае ўвесь спектр гістарычных крыніц, на якія таксама абапіраюцца іншыя галіны гістарычнай навукі і гісторыя ў цэлым. Разам з тым спецыфіка аб'екта і прадмета даследавання вызначаюць прыярытэтнасць крыніц, што непасрэдна адлюстроўваюць канкрэтныя палітычныя з'явы, працэсы, падзеі. У сваю чаргу, іх раскрыццё немагчыма без уключэння так званых «універсальных» крыніц, дзе нароўні

[1] Смалянчук А. Беларускае пытанне і польскі рух (1905–1917) // Полымя. – 1994. – № 6. – С. 176–192; Яго ж. Да пытання аб ролі палітычнай ідэалогіі ў развіцці беларускага нацыянальнага руху ў XIX – пач. XX ст. …; Яго ж. Дзённік Міхала Ромера як крыніца па гісторыі Беларусі пачатку XX ст. // Беларус. гіст. агляд. – 1998. – Т. 5. – Сш. 1 (8). – С. 103–111; Яго ж. «Краёвасць» у беларускай і літоўскай гісторыі (1905–1940) // Беларус. гіст. агляд. – 1997. – Т. 4. – Сш. 1–2. – С. 19–33; Яго ж. Краёвец Антон Луцкевіч (Выдавецкая дзейнасць А. Луцкевіча ў 1912–1915 гг. і «краёвая» ідэалогія) // Гіст. альм. – 1998. – № 1. – С. 27–51; Яго ж. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй …

з інфармацыяй палітычнага характару сустракаецца больш шырокае кола факталагічнага матэрыялу.

Да першай, спецыялізаванай групы крыніц адносяцца дакументы палітычных, грамадскіх партый і арганізацый, заканадаўчых і выканаўчых органаў дзяржаўнай улады, палітычныя сачыненні і публіцыстыка; да «ўніверсальнай» групы – заканадаўчыя матэрыялы, справаводчыя дакументы, статыстычна-ўліковыя крыніцы, перыядычны друк, крыніцы асабістага паходжання (дзённікі, мемуары, перапіска). Такое спалучэнне абумоўлена, з аднаго боку, тым, што ўсе сферы грамадскага жыцця так ці інакш звязаны з палітыкай; з другога – традыцыйна высокай роляй грамадска-палітычных падзей у лёсе народа і той краіны, дзе яны адбываюцца. Атрымаўшы поспех або правал, яны заўсёды пакідаюць мноства слядоў, бо ўцягваюць у сваю арбіту значную колькасць людзей, чыё дачыненне адлюстроўваецца ў розных па характары і змесце крыніцах. І відавочна, для аб'ектыўнага даследавання сутнасці і значэння такіх феноменаў навукоўцам неабходна прааналізаваць як мага больш тэматычных дакументаў. Аднак часта гэта ўскладняецца знаходжаннем матэрыялаў не толькі ў розных архівах, а нават у розных дзяржавах. У выніку база крыніц атрымоўвае даволі шырокую геаграфію. Дадзенае выданне не стала выключэннем, аб'яднаўшы ў сабе тэматычныя архіўныя скарбы Беларусі, Расіі, Літвы, Польшчы. Тым больш што лёсы пералічаных краін былі шчыльна пераплецены і ўцягнуты ў арбіту вывучаемых гістарычных рэалій. Улічваючы згаданую вышэй асаблівасць дакументальнага масіву па палітычнай гісторыі, засяродзімся глыбей на спецыфічных групах крыніц для кожнага вылучанага тэматычнага блока.

***Праблемы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу і спецыфікі палітыкі імперскай уніфікацыі «ўскраін» з цэнтрам.*** І тут ні ў якім разе нельга абысціся без гісторыі дзяржаўных устаноў, якая знаходзіцца на стыку гістарычных і прававых дысцыплін. З юрыдычнымі навукамі гісторыю дзяржаўных устаноў злучае частковае адзінства аб'екта даследавання – палітычныя і прававыя інстытуты і, канешне, выкарыстанне заканадаўчага матэрыялу. Таму найважнейшай крыніцай па эвалюцыі мясцовых органаў дзяржаўнай улады і кіравання з'яўляецца «Полное собрание законов Российской империи». У артыкулах законаў змяшчаюцца палажэнні аб рэформах, правілы ўвядзення іх у дзеянне, указы пра змены, дапаўненні або тлумачэнні тых ці іншых артыкулаў палажэнняў, статутаў або ўстаноў. Яны стваралі заканатворчую базу функцыянавання мясцовай адміністрацыі. Заканадаўчыя дакументы даюць магчымасць асэнсавання арганізацыі, кампетэнцый, функцый, штатаў як асобных дзяржаўных устаноў, так і ўсяго дзяржаўнага апарату.

Аднак заканадаўчы дакументальны комплекс паказвае толькі тэарэтычны бок справы дзяржаўнага ўладкавання. Не заўсёды пакладзены на паперу закон знаходзіць поўнае прымяненне на практыцы. Таму вернымі памагатымі ў гэтым напрамку выступаюць дакументы афіцыйнага справаводства. У прыватнасці, дакументы з фондаў цэнтральных і вышэйшых урадавых устаноў Расій-

скага дзяржаўнага гістарычнага архіва ў г. Санкт-Пецярбургу (далей – РДГА), Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў г. Мінску (далей – НГАБ), Аддзела рукапісаў Расійскай нацыянальнай бібліятэкі ў Санкт-Пецярбургу (далей – АР РНБ) і Навукова-даведачнай бібліятэкі Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва ў г. Санкт-Пецярбургу (далей – НДБ РДГА). Для прыкладу прывядзём найбуйнейшыя фонды з РДГА: Камітэт міністраў (фонд 1263), Савет міністра ўнутраных спраў (фонд 1281), Канцылярыя міністра ўнутраных спраў (фонд 1282), Дэпартамент агульных спраў МУС (фонд 1284), Дэпартамент паліцыі МУС (фонд 1286), Уласная яго імператарскай вялікасці канцылярыя (фонд 1409), Галоўнае ўпраўленне па справах друку МУС (фонд 776), Дэпартамент духоўных спраў замежных веравызнанняў МУС (фонд 821), Асобая нарада аб перадачы спраў, якія маюць мясцовае значэнне, з цэнтральных дзяржаўных устаноў у мясцовыя ўстановы (фонд 1234). Сярод выкарыстаных крыніц маюцца групы распараджальнай (цыркуляры, загады, інструкцыі, распараджэнні мясцовых генерал-губернатараў і губернатараў), справаздачнай (губернатарскія гадавыя справаздачы, рэвізіі чыноўніка МУС), пратакольнай дакументацыі (журналы пасяджэнняў камітэтаў) і міжведамасная дзелавая перапіска (рапарты, данясенні, афіцыйныя даведкі міністэрстваў, дакладныя запіскі чыноўнікаў розных рангаў). Усе яны садзейнічаюць выяўленню фактычнага матэрыялу аб фарміраванні органаў кіравання ў Беларусі, умовах функцыянавання сістэмы губернскіх устаноў, асаблівасцях структуры мясцовых органаў улады, прычынах іх рэфармавання, прапановах мясцовага кіраўніцтва па ўдасканаленні мясцовага дзяржапарату, кадравым складзе ўсёй вертыкалі ўлады, сістэме прадастаўлення льгот і пераваг рускім чыноўнікам у краі.

Цікавымі знаходкамі ў інфармацыйным плане з’яўляюцца матэрыялы рэвізій чыноўнікамі МУС мясцовых органаў кіравання ў 1867–1868 гг. з асабістых фондаў міністра ўнутраных спраў П. А. Валуева (фонд 908) і графаў Паленаў (фонд 1016). Яны ўтрымліваюць звесткі пра функцыі чыноўнікаў, асабліва міравых пасрэднікаў і паліцэйскіх, іх становішча, ацэнку стану справаводства, ствараюць карціну сітуацый на месцах, а тым самым акрэсліваюць узровень эфектыўнасці апарата кіравання, хуткасць разгляду спраў.

Важны пласт каштоўных тэматычных дакументаў утрымліваецца ў фондах НДБ РДГА. Імі закранаюцца пытанні аб губернскай рэформе і аб губернскіх установах (фонд 122), генерал-губернатарствах і губернатарствах (1879–1911) (фонд 131), кіраванні і стане асобных губерняў Заходняга краю (фонд 278), пераглядзе заканадаўства аб Заходнім краі згодна з указам ад 12 снежня 1904 г. (фонд 279), аднаўленні сходаў і выбараў дваранства ў 9 заходніх губернях (фонд 2525). Праблемам заснавання і скасавання генерал-губернатарстваў, правоў і абавязкаў генерал-губернатараў прысвечаны матэрыялы фонду 2916. Дакументы Камісіі для канчатковай распрацоўкі праекта Палажэння аб асаблівых перавагах грамадзянскай службы ў аддаленых губернях імперыі за 1871–1883 гг. змешчаны ў фондзе 2745.

Унікальнасць тэматычнага патэнцыялу беларускага архівасховішча (НГАБ) заключаецца ў яго рэгіянальных адметнасцях фактычнага напаўнення матэрыялу. Тут і стандартны корпус справаводчых крыніц (загады міністэрстваў, фармулярныя спісы, ведамасці, дзелавая перапіска) з фондаў канцылярый губернатараў (фонды 295, 1430, 2001), губернскіх праўленняў (фонд 1416), і арыгінальныя, абумоўленыя шэрагам аспектаў даследуемай праблемы з фондаў губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей (мінскай – фонд 242, магілёўскай – фонд 2014, віцебскай – фонд 2642), Мінскай губернскай нарады па пераглядзе заканадаўства аб сялянах (фонд 68), Мінскай управы па справах земскай гаспадаркі (фонд 324), Мінскай губернскай камісіі па ацэнцы маёнткаў, якія падлягалі абавязковаму продажу (1865–1871 гг.) (фонд 1591), кіравання дзяржаўнымі маёмасцямі Віцебскай губерні (фонд 2514). Дзякуючы ім узнікае магчымасць устанавіць механізм камплектавання кадравага складу; стан справаводства; выявіць планы цэнтральных улад па ўдасканаленні структуры мясцовага кіравання; фінансаванне і напрамкі дзейнасці адміністрацыйных структур; прасачыць спецыфіку сістэмы кіравання беларуска-літоўскімі губернямі ў сувязі з грамадска-палітычнымі рухамі (паўстанні XIX ст., вайна 1812 г.); ахарактарызаваць крокі ўрада па рэалізацыі абмежавальнай палітыкі ў кадравым пытанні, кіраванні дзяржаўнымі маёмасцямі і земскай гаспадаркай.

Значным дапаўненнем крыніцазнаўчай базы па праблеме з'яўляюцца мемуары, дзённікі і асабістая перапіска дзяржаўных дзеячаў: успаміны міністра ўнутраных спраў П. А. Валуева, віленскага генерал-губернатара М. М. Мураўёва, мясцовых чыноўнікаў А. Гене, А. Г. Казначэева, А. М. Масалова, П. А. Чарэвіна[1]. У АР РНБ захоўваюцца асабістыя фонды віленскага генерал-губернатара П. П. Альбядзінскага (фонд 16) і кіраўніка справамі Камітэта міністраў у 1861–1875 гг. Ф. П. Карнілава (фонд 379), якія адлюстроўваюць погляды вышэйшых адміністратараў на праблему дзейнасці адміністрацыйнага апарату ў беларуска-літоўскіх губернях.

Важнае значэнне для даследавання дадзенай праблемы маюць статыстычна-даведачныя матэрыялы. Акрамя ведамасных выданняў статкамітэтамі друкаваліся «Памятные книжки…», «Обзоры…» Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў, а таксама вузкаспецыялізаваныя, прызначаныя для службовага карыстання даведачныя матэрыялы – «Список лиц, служащпх по ведомству Минпстерства внутренних дел», «Сметы доходов

[1] [Валуев П. А.] Дневник П. А. Валуева, министра внутренних дел : в 2 т. – М., 1961. – Т. 2 : 1865–1876; Гене А. Виленскне воспомннання // Русская старнна. – 1914. – № 6. – С. 580–610; Казначеев А. Г. Между строкамн одного формулярного спнска, 1823–1881 // Русская старнна. – 1881. – № 12. – С. 817–880; Мосолов А. Н. Вnленские очерки, 1863–1865 гг. – СПб., 1898; Муравьев М. Н. Запнски об управленнн Северо-Западным краем и об усмиреннн в нем мятежа 1863 и 1864 гг. // Русская старнна. – 1882. – № 11. – С. 387–432; Черевин П. А. Воспоминания, 1863–1865. – Кострома, 1920.

расходов Мнннстерства внутренних дел»[1]. Яны змяшчаюць звесткі аб губерн-кіх і павятовых установах, спісы чыноўнікаў і даныя аб вышэйшых службовых собах губерні. У выніку ствараюцца падставы для вызначэння сацыякультур-ага аблічча служачых усіх рангаў губерняў і паветаў: адукацыя, веравызнанне, лужбовы стаж, узнагароды, фінансава-гаспадарчае забеспячэнне. Камплек-ацыю надзвычай поўных колькасных даных па характарыстыцы чыноўнікаў дміністрацыйных, судовых і паліцэйскіх органаў у канцы XIX ст. утрымлівае ершы ўсеагульны перапіс насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г.

***Палітычная дзейнасць дваранства беларуска-літоўскіх губерняў у час апалеонаўскіх войнаў.*** Корпус дакументаў для раскрыцця сутнасці названай эмы фактычна не адрозніваецца ад папярэдніх тэматычных блокаў. Але для ольш поўнага аналізу выкарыстаны біяграмы афіцэраў польскіх легіёнаў[2]. Ва-ныя падзеі пачатку XIX ст. асветлены ў надзвычай вялікім коле гістарычных акументаў і прадстаўлены амаль усімі існаваўшымі ў першай палове XIX ст. дамі пісьмовых крыніц. Значная частка гістарычных крыніц выдадзена[3]. Кож-ая з груп нясе сваю інфармацыйную нагрузку. Так, заканадаўчыя матэрыялы ызначалі парадкі функцыянавання і фармальны бок узаемаадносін у рускай рміі. Матэрыялы справаводства, у выглядзе дыпламатычнай дакументацыі, апамагаюць усведамленню знешнепалітычнай сітуацыі падчас вайны 1812 г. амымі колькаснымі і прадстаўнічымі ў гэтым плане з'яўляюцца фонды Расій-кага дзяржаўнага ваенна-гістарычнага архіва (РДВГА). Важную ролю ў дасле-ванні падзей 1812 г. адыгрываюць апублікаваныя афіцыйныя паведамленні ваенная публіцыстыка абодвух бакоў, а таксама крыніцы асабістага пахо-кання[4]. Ваенна-аператыўныя дакументы ў супастаўленні з лістамі, дзённікамі успамінамі даюць магчымасці для перагляду шэрага замацаваных элементаў старычных апісанняў бітваў, удакладнення паслядоўнасці падзей і іх храна-етрычных параметраў, актуалізацыі навуковага разгляду ваенна-палітычных ыскусій у тагачасным грамадстве.

---

[1] Список лиц, служащих по ведомству Мииистерства виутренних дел [1892–1914]. – СПб., 92–1914; Сметы доходов и расходов Министерства внутренних дел [1892–1914]. – СПб., 1892–3.

[2] Pachonski J. Oficerowie legionow Polskich, 1796–1807. – Krakow, 1998–2003. – T. 2 : Słownik grafіczny oficerow Legionow Polskich 1796–1807.

[3] Сборник императорского русского исторического общества. – СПб., 1909. – Т. 128; Воеи-ий К. Акты, документы и материалы для политической и бытовой истории 1812 года. – СПб., 2. – Т. 3 : Белоруссия в 1812 году; Виленский времеиик. – Вильио, 1913. – Ки. IV, ч. 2; Оте-твенная война 1812 г. Отд. I. – СПб., 1910. – Т. XIV; Документы и материалы, отиосящиеся стории Отечественной войны. – Вильна, 1912; Беларусь и война 1812 года. – Минск, 2012.

[4] Дубровин Н. Отечествеиная война в письмах современииков (1812–1815 гг.). – М., 2006; кольницкий М. Исполнено по высочайшему повелению… – Мннск, 2003; Часовая мінская эта. 1812 год. – Мінск, 2008; 1812 metų Lietuvos laikinosios vyriausybės komisijos posėdžių tokolai. – Vilnius, 2012; Коленкур А. де. Мемуары. Поход Наполеона в Россию. – М., 1943; 2 год в воспоминаниях современников. – М., 1945.

***Палітычнае становішча ў 1815–1830 гг.*** Асэнсаванне «прапольскіх» і «прарасійскіх» настрояў сярод уплывовых арыстакратаў і бюракратаў у гэты перыяд звязана з дынамікай трох наяўных цэнтраў актыўнасці (аўтаномнае канстытуцыйнае Царства Польскае з намеснікам Канстанцінам Паўлавічам і прадстаўніком Аляксандра І М. М. Навасільцавым (Варшава); Вільня, перш за ўсё як цэнтр навучальнай акругі, папячыцелямі якой былі А. Е. Чартарыйскі (1803–1823), М. Навасільцаў (1824–1831); імператар і цэнтральныя імперскія органы кіравання (Пецярбург)), якія абумовілі яго крыніцазнаўчую базу. Тут спалучаны дакументальныя крыніцы Літвы, Расіі, Польшчы, Беларусі. З Дзяржаўнага гістарычнага архіва Літвы (ДГАЛ) выкарыстаны справаводчыя матэрыялы фондаў: Канцылярыі Віленскага, Ковенскага і Гродзенскага генерал-губернатара (фонд 378); Канцылярыі Віленскага грамадзянскага губернатара (фонд 380); Канцылярыі Віленскага паліцмайстра (фонд 421); Упраўлення Віленскай навучальнай акругі (фонд 567). З НГАБ – усе наяўныя фонды генерал-губернатарскіх і губернатарскіх канцылярый (фонды 295, 1297, 1430, 2001) і фамільныя фонды князёў Друцкіх-Любецкіх, графаў Плятэр-Зібергаў і інш.); з НГАБ у г. Гродне – Канцылярыі Гродзенскага губернатара (фонд 1). У РДГА асноўная праца праводзілася ў фондзе 14 (Канцылярыя М. Навасільцава), фондзе 1152 (Дзяржаўны Савет), фондзе 735 (Канцылярыя Міністра народнай асветы); фондзе 1409 (Уласная яго імператарскай вялікасці канцылярыя).

Як відаць, асноўную масу складаюць фонды ўстаноў/арганізацый канца XVIII – сярэдзіны XIX ст. Яны, перш за ўсё, увасоблены ў справаводчых дакументах устаноў, якія кантралявалі грамадскую дзейнасць і рэгламентавалі стварэнне грамадскіх аб'яднанняў. Сярод катэгорый крыніц пераважаюць справаздачныя матэрыялы і дзелавая перапіска. Тут, у прыватнасці, трэба згадаць архіўныя справы аб заснаванні таварыстваў з данясеннямі, рапартамі і справаздачамі чыноўніцтва, якія прадстаўляліся губернатарам, пра рознага кшталту грамадскія ініцыятывы. Карысны для ўзбагачэння навуковага аналізу і справаздачы добраахвотных аб'яднанняў, іх статуты, пратаколы і стэнаграфічныя справаздачы пасяджэнняў, справаздачы аб дзейнасці аб'яднанняў, дакладныя запіскі і хадайніцтвы, што ўтрымліваюцца ў фондах губернскіх прысутнасцей па земскіх і гарадскіх справах (фонды 22, 2508). Прыроду ўзаемаадносін дзяржаўнай улады і грамадскіх структур раскрывае дзелавая перапіска – «Обзоры губерний», прадпісанні губернатараў, перапіска органаў гарадскога самакіравання з саслоўнымі органамі самакіравання і выканаўчымі органамі грамадскіх арганізацый, просьбы і скаргі, рапарты службовых асоб. У сваю чаргу, функцыянаванне кожнага таварыства кантралявалася паліцэйскімі органамі. Іх міжведамаснае ліставанне ўтрымлівае цікавыя звесткі аб стаўленні вышэйшага кіраўніцтва да развіцця палітычнай свядомасці жыхароў рэгіёна. Сюды ж адносяцца і ўсе судова-следчыя справы з адпаведным дакументазваротам па выкрыцці нелегальных і апазіцыйных ураду таварystваў.

Арыгінальны матэрыял для раскрыцця пэўнага кола аспектаў праблемы, асабліва ў дачыненні да перыядычнага друку, можна знайсці ў фондах Бела-

руская дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва (далей – БДАМЛМ) перыядычныя выданні, прыжыццёвыя выданні пісьменнікаў XIX ст.). Менавіта перыёдыка акрэслівае сэнс грамадскага меркавання. Увогуле перыядычны друк з'яўляецца не толькі прадметам даследавання, але і крыніцай інфармацыі аб тым, якія пытанні былі ў вывучаны перыяд у фокусе публічных дыскусій[1]. Перыядычныя выданні даюць пэўны матэрыял для аналізу інфармаванасці сучаснага адукаванага грамадства аб унутрыімперскіх і замежых справах.

Спецыфіка прадмета даследавання абумоўлівае неабходнасць выкарыстання літаратурных і філасофскіх твораў як крыніц, якія адлюстроўваюць важныя аспекты развіцця грамадска-палітычных з'яў[2]. Літаратурныя альманахі, навуковыя тыднёвікі і памфлеты дазваляюць вызначыць кірункі грамадскага меркавання, спалучаючы грамадска-палітычнае і эмацыйнае гучанне.

Важнай крыніцай таксама з'яўляюцца ўспаміны і дзённікі Г. І. Дабрыніна, М. Жданава, І. С. Жыркевіча, С. Патоцкай, П. В. Кукальніка, А. Ламачэўскага, Л. Патоцкага, Е. З. Фялінскай, Г. Пузынінай, С. Мараўскага. Паколькі прыватная перапіска ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. з'яўлялася важнейшым сродкам камунікацыі, перадачы навін, абмеркавання падзей, то ліставанне ўваходзіць у кола істотных крыніц для вывучэння тэмы[3].

***Паўстанні 1830–1831 гг. і 1863–1864 гг.*** Гэтыя паўстанні раскрыты фактычна на аднатыпных пісьмовых крыніцах. Адзінае адрозненне – іх фондавае размяшчэнне ў сувязі з храналагічнай і тэматычнай разбіўкай згодна з нормамі і правіламі архівасховішчаў. У сваю чаргу, каб раскрыць спецыфіку падзей менавіта ў беларуска-літоўскіх губернях, неабходна звярнуцца да мясцовых рэгіянальных архіваў (НГАБ, НГАБ у г. Гродне). Так, найбуйнейшымі фондамі накаплення тэматычнага матэрыялу з'яўляюцца фонды ваенных і грамадзянскіх губернатараў, губернскіх праўленняў, канцылярый, павятовых начальнікаў (фонды НГАБ: 295, 296, 1297, 1416, 1430, 1521, 2001, 2003, 2569; НГАБ у г. Гродне – 1). Абмовімся, што дадзеныя дакументы створаны ўладнымі органамі, таму ў першую чаргу раскрываюць палітыку расійскага ўрада па падаўленні выступленняў і правядзенні рэпрэсіўных мерапрыемстваў у адносінах да ўдзельнікаў. Практычнай рэалізацыяй карнай лініі ўрадавага курса займаліся паліцэйскія і судова-следчыя камісіі. Пакінутая імі дакументацыя не проста дае магчымасць прасачыць іх дзейнасць праз нарматыўныя матэрыя-

[1] Wiadomosci Brukowe: wybor artykułow / wybr. i oprac. Z. Skwarczynski. – Wrocław ; Warszawa ; Krakow, 1962; Ciechowski W. Czasopisma polskie na Litwie. Cz. 1 // Kwartalnik Litewski. – 1910. – T. 2. – S. 40–41.

[2] Rzewuski H. Mieszaniny obyszajowe : w 2 t. – Wilno, 1841–1843; Bochwic F. Obraz mysli mojej. – Wilno, 1839; Сыракомля У. Вандроўкі па маіх былых ваколіцах : успаміны, даследаванні гісторыі і звычаяў. – Мінск, 1992; Massalski E. Pan Podstolic, albo, Czém jestesmy, czém byc mozemy: romans administracyjny. – Wilno, 1831–1834. – T. 1–5.

[3] Rzewuski H. Pisma : w 6 t. – Petersburg, 1851; Archiwum filomatow. Cz. 1 : Korespondencja filomatow, 1815–1823 : w 5 t. – Krakow, 1913; Grabowski M. Korespondencja literacka : w 2 t. – Wilno, 1842–1843.

лы (пастановы аб іх заснаванні/закрыцці, рэгламентуючыя працу акты, цыркуляры, загады), але і дапамагае ўбачыць аблічча ўдзельнікаў паўстанцкага руху праз судовыя заключэнні і алфавітныя спісы. Апошнія ўяўлялі сабой уліковы від дакумента з пазначэннем: імя і прозвішча асобы, сацыяльнага паходжання, веравызнання, месца жыхарства, сутнасці абвінавачвання і прысуду.

Вялікае значэнне таксама належыць рознай распараджальнай дакументацыі і дзелавой перапісцы. Прасачыць палітыку царызму да розных катэгорый насельніцтва (накладанне спагнанняў, кантрыбуцый, стварэнне вайсковых атрадаў, сельскай варты, правядзенне стымулюючых мер) магчыма на падставе загадаў, цыркуляраў, інструкцый, распараджэнняў, часткова рапартаў. Шмат дакументаў прысвечана вырашэнню маёмасных пытанняў (секвестр і канфіскацыя маёмасці) удзельнікаў падзей. Сярод адпаведных крыніц сустракаюцца копіі канфірмацый.

Падзеі другой паловы XIX ст. адлюстраваны ў матэрыялах Мінскага павятовага суда (НГАБ, фонд 159), у якім змешчаны найцікавейшыя матэрыялы па так званым маніфестацыйным руху (спісы ўдзельнікаў спеваў і самі забароненыя песні). А вось адметнасці паўстання 1830–1831 гг. раскрыты вялікай колькасцю даносаў. Атмасфера татальнага нагляду, агульнай падазронасці, ухвалення данасіцельства, гатоўнасці з боку расійскай адміністрацыі прымяняць рэпрэсіўныя меры пры малейшым падазрэнні ў шэрагу выпадкаў выкарыстоўвалася жыхарамі для атрымання асабістай выгады ці для звядзення асабістых рахункаў. Каштоўны інфармацыйны матэрыял змяшчае дзелавая перапіска па зборы звестак аб арыштаваных асобах, пошуках абвінавачаных, вобысках.

Высвятленню ролі духавенства ў падзеях садзейнічаюць фонды рымска-каталіцкай і праваслаўнай кансісторый (1781, 136), дзе дапаможную функцыю ў выяўленні некаторых тэндэнцый адносна стаўлення да рэалій прадстаўнікоў духоўнага сану выконваюць фармулярныя і асабовыя спісы, рапарты іерархаў, узнагародныя лісты. Па паўстанні 1863–1864 гг. знойдзены арыгінальны графічны і публіцыстычны матэрыял[1].

***Палітычнае становішча сярэдзіны 1860-х гг. і да 1904 г.*** Вылучаная архіўная карта дакументальных збораў для паўстанняў выкарыстоўвалася і для характарыстыкі палітычнага становішча гэтага перыяду, бо многія падзеі былі прадыктаваны паўстаннем, вынікалі з яго або з'яўляліся натуральным следствам. Умоўна назавём іх адгалоскамі падзей 1863–1864 гг. Напрыклад, інтэнсіфікацыя русіфікатарскай палітыкі, вырашэнне пытанняў з лёсам ссыльных, арыштаваных, пашырэнне прынцыпаў імперскага кіравання і г. д. Праўда, у аналіз грамадска-палітычных рухаў лагічна ўключана публіцыстыка народнікаў і сацыял-дэмакратаў[2]. Значным рэпрэзентатыўным дапаўненнем па дзей-

[1] НГАБ. – Ф. 296. Воп. 1. Спр. 29а; Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1435. Арк. 6.

[2] Публицистика белорусских народников : иелегальные издания белорусских народников (1881–1884).

насці нелегальнай апазіцыі з'яўляюцца крыніцы з фондаў Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі (ДАРФ, Масква). Гэта, перш за ўсё, фонд Дэпартамента паліцыі (фонд 102), дзе захоўваецца афіцыйная дакументацыя на асоб, якія трапілі ў арбіту ўвагі паліцэйскіх ведамстваў, матэрыялы нагляду за рэвалюцыянерамі, іх перлюстраваная перапіска; асабістыя фонды І. І. Фандамінскага (фонд 6212), В. М. Чарнова (фонд 5847), У. Л. Бурцава (фонд 5802), П. А. Кулікоўскага (фонд 1775), якія змяшчаюць вельмі каштоўныя матэрыялы пра функцыянаванне нелегальных арганізацый, жыццё і светапогляд актывістаў. Спецыфічныя, але вельмі карысныя звесткі ўтрымліваюцца ў стэнаграмах допытаў былых чыноўнікаў Дэпартамента паліцыі фонду Надзвычайнай следчай камісіі Часовага ўрада (фонд 1467). А дакументы фонду 5881 (Калекцыя асобных дакументаў і мемуараў эмігрантаў) дазваляюць выявіць цікавыя факты аб жыцці і дзейнасці некаторых рэвалюцыянераў, у прыватнасці Р. А. Гершуні.

***Працэс фарміравання і структуры грамадскіх рухаў.*** Для даследавання грамадскіх рухаў важна ўлічваць дакументы, якія тычацца ўнутранай палітыкі Расійскай імперыі. У прыватнасці, яе заканадаўчай базы, дзе пазначаны правілы і нормы, што рэгулявалі парадак выбараў органаў гарадскога самакіравання, іх структуру і склад, сферы кампетэнцыі і размеркаванне паўнамоцтваў, узаемаадносіны з дзяржаўнай адміністрацыяй. Найбольш поўна яны прадстаўлены ў зборы «Полное собрание законов Россннской нмперип».

Асобнае месца сярод тэматычных крыніц займае цэнзурнае заканадаўства, у адпаведнасці з якім ствараліся, развіваліся і функцыянавалі цэнзурныя ўстановы, вызначалася кола абавязкаў цэнзараў. Пераважная большасць дакументаў, якія характарызуюць арганізацыю і дзейнасць цэнзурных устаноў, знаходзіцца ў фондах РДГА: Цэнтральнае ўпраўленне па цэнзурным ведамстве (фонд 775), Савет міністра ўнутраных спраў па справах кнігадрукавання (фонд 774), Галоўнае ўпраўленне па справах друку (фонд 776), Санкт-Пецярбургскі цэнзурны камітэт (фонд 777), Камітэт цэнзуры замежнай (фонд 779). У гэтых фондах захоўваюцца дакументы, звязаныя са зменамі структуры цэнзурных камітэтаў, увядзеннем новых пасад; даклады міністра ўнутраных спраў, справаздачы губернатараў аб стане цэнзурнага нагляду, ведамасці інспектараў друкарняў і кніжнага гандлю, справаздачы цэнзурных камітэтаў і асобных цэнзараў, праекты штатаў цэнзурнага ведамства. Вялікую цікавасць уяўляюць даведнікі, выдадзеныя Міністэрствам унутраных спраў, якія змяшчаюць тлумачэнні цэнзурных законаў, цыркуляры губернатарам. Пэўны фактычны матэрыял утрымліваюць юбілейныя выданні міністэрстваў унутраных спраў, народнай асветы і Камітэта міністраў[1].

[1] Устав о цензуре и печати / сост. В. П. Ширков. – СПб., 1900; Сборник распоряжений по делам печати (с 1863 по 1-е сент. 1865 г.). – СПб., 1865; Сборник постановлений и распоряжений по делам печати с 5 апр. 1865 по 1 авг. 1868 г. – СПб., 1868; Рождественский С. В. Исторический обзор деятельности Миннстерства народного просвещения, 1802–1902. – СПб., 1902; Журналы Высочайше учрежденной комиссни для рассмотрения проекта Устава о книгопечатании. –

***Рэвалюцыя 1905–1907 гг.*** Пачатак XX ст. прайшоў пад знакам рэвалюцыі, а таксама з'яў і працэсаў, якія яна прадвызначыла. Асаблівая рыса базы крыніц па гісторыі гэтай рэвалюцыі заключаецца ў наяўнасці на сучасным этапе велізарнага корпуса апублікаваных матэрыялаў. Відавочна, што ніводная гістарычная з'ява перыяду Расійскай імперыі не забяспечана такой колькасцю дакументальных публікацый. Расійскімі даследчыкамі праведзены некаторыя падлікі, згодна з якімі ўжо да 20-годдзя падзеі свет пабачылі 60 зборнікаў дакументаў, а да 50-годдзя выйшла 18 тамоў серыі «Революция 1905–1907 гг.» агульным аб'ёмам 1000 друкаваных аркушаў, прычым «на месцах» (у саюзных рэспубліках) надрукавалі яшчэ 35 зборнікаў аб'ёмам 700 друкаваных аркушаў. У справе было задзейнічана 500 архівістаў, прагледжана 60 тысяч архіўных спраў з цэнтральных і рэгіянальных архівасховішчаў СССР[1].

Зборнікі пераважна складаліся з традыцыйных тэматычных блокаў: роля партыі бальшавікоў у рэвалюцыі, рабочы і сялянскі рух, выступленні ў арміі. Цэнтральнае месца займалі рэзалюцыі ЦК РСДРП і яе мясцовых арганізацый, улёткі, бюлетэні, рэзалюцыі працоўных сходаў, справаздачы фабрычных інспекцый і паведамленні аб ходзе стачак/мітынгаў. Сярод адпрацаваных архіўных фондаў лідзіравалі партыйныя фонды і фонды царскіх дзяржаўных устаноў. Нягледзячы на пэўную суб'ектыўнасць у падборы крыніц, не зусім дасканалую археаграфічную апрацоўку, некаторыя стылістычныя падмены і скажэнні ў змесце дакументаў, апублікаваныя зборнікі – найкаштоўнейшы крыніцазнаўчы матэрыял і для сучасных гісторыкаў.

Выкарыстаныя архіўныя матэрыялы прадстаўлены ў большасці сваёй справаводчай дакументацыяй. Пальма першынства належыць дакументам з фондаў губернатараў (НГАБ – фонды 295, 1430, 2001; НГАБ у г. Гродне – фонд 1), жандарскіх, паліцэйскіх, судовых і фабрычных устаноў (НГАБ – фонды 9, 183, 311, 1414, 1574; НГАБ у г. Гродне – фонды 18, 34, 366). Асноўную групу склалі данясенні губернатараў, фабрычнай інспекцыі, жандарскіх афіцэраў і іх памочнікаў, спраўнікаў, адпаведна іх жа рапарты, паведамленні, тэлеграмы, а таксама прадстаўленні пракурораў акруговых судоў і іх заключэнні. Дадзеныя матэрыялы дазваляюць больш поўна высвятліць сутнасць і каларыт падзей 1905–1907 гг. у беларуска-літоўскіх губернях, заўважыць адрозныя рысы атмасферы грамадска-палітычнага жыцця ў цэнтры і на перыферыі Расійскай імперыі.

СПб., 1863; Закоиы о печати: настольная справочная киига. – М., 1890; Краткое обозреиие направления периодических изданий и газет и отзывов их по важнейшим правительствеиным и другим вопросам за 1862 год. – СПб., 1862; Материалы, собраииые особою комиссией, Высочайше учрежденной 2 ноября 1869 г., для пересмотра действующих постаиовлений о цензуре и печати. – СПб., 1870; Собраиие материалов о иаправлении различных отраслей русской словесности за последиее десятилетие и отечественной журналистики за 1863 и 1864 гг. – СПб., 1865.

[1] Пушкарев И. М. Новый взгляд на корпус источииков по революции 1905–1907 гг. // 1905 год – иачало революционных потрясений в России XX века. – М., 1996. – С. 80–90.

Новым відам у комплексе тэматычных матэрыялаў з'явіліся дакументы ірасіцельнай катэгорыі пісьмовых крыніц – петыцыі, прыгаворы і хадайніц-ы. Пачатак ім быў пакладзены ўказам 18 лютага 1905 г. аб дазволе насель-цтву складаць парады па ўдасканальванні дзяржаўнага добраўпарадкавання, иэта яго заключалася ў падаграванні царысцкіх ілюзій, перш за ўсё сярод лянства. Змест дакументаў розны па сваім значэнні і сэнсе. Ён заключаўся ыказванні просьбаў, запытаў, патрабаванняў канкрэтных мер пры вырашэн-наяўных праблем, змяшчаў сацыяльна-эканамічныя, бывала, і палітычныя аграмы. Меліся там і словы падзякі, даверу ўраду, асабліва ў дакументах лянскага паходжання. Петыцыі/прыгаворы накіроўваліся на імя імператара, ністраў, пазней Дзяржаўнай думы або яе членаў. Для аналізу рэвалюцыйных дзей яны карысныя магчымасцю прасачыць настроі насельніцтва і адносіны рэвалюцыі. Канешне, іх дакладнасць абцяжарваецца пошукам сапраўднага гара (іх маглі складаць агітатары, сялянскія сходы, існавалі нават узорныя ыгаворы), сутнасцю зусім новых, не ўласцівых пэўным катэгорыям насель-цтва патрабаванням, і вялікім ідэалагічным уплывам палітычных партый.

Нечым падобныя да прыгавораў і петыцый у сэнсавай нагрузцы гістарычна-аналізу адрасы падтрымкі або ганьбы дзеянняў пэўнай асобы, установы. Яны ксама дэманструюць атмасферу настрою жыхароў рэгіёна, іх грамадска-па-ычную прыхільнасць, форму дачынення да падзей.

***Дзейнасць палітычных партый у краі на пачатку XX ст.*** Даследаван-гісторыі палітычных партый немагчыма без законных і падзаконных актаў, о рэгламентавалі функцыянаванне палітычных партый і арганізацый і за-цоўвалі прынцыпы і нормы рэгулявання грамадска-палітычных адносін ва овах самадзяржаўя. Большасць гэтых дакументаў узята з «Полного собрання онов Российской имперни». У справаводчай дакументацыі дзяржаўных ор-аў кіравання знайшлі адлюстраванне важныя практычныя аспекты ўтварэн-і функцыянавання палітычных партый і арганізацый у рэгіёне. Асаблівую авасць у сувязі з гэтым уяўляюць матэрыялы, якія змяшчаюць звесткі пра ротивоправительственную» дзейнасць або ўдзел палітычных аб'яднанняў ыбарах у Дзяржаўную думу.

Утварэнне новага дзяржаўнага інстытута (Думы) ініцыявала стварэнне бнага (пратакольнага) корпуса справаводчых дакументаў – пратаколы, стэна-мы, журналы пасяджэнняў Думы і нарад. Разам з выбарчымі лістамі яны мацоўваюць навуковыя высновы аб сістэме выбараў, сацыяльным абліччы аршчыкаў, іх палітычных і грамадскіх перакананнях, памкненнях. Ускос-такія крыніцы характарызуюць грамадска-палітычную свядомасць розных ыяльных груп. Гэта яшчэ раз падкрэслівае сутнасць справаводчых крыніц лане іх залежнасці ад функцый, задач, кампетэнцый дзяржаўных устаноў. ктычна ў кожнай інстанцыі – свой дакументазварот, таму яны незамяняль-і ў рамках любога гістарычнага даследавання. Так, з'яўленне рабочых, пра-

фесійных арганізацый таксама прадугледжвала адпаведны дакументальны корпус у форме пастаноў і пратаколаў сходаў, меліся свае статуты, уставы. Адкуль і пачэрпнуты даныя для апісання іх дзейнасці.

Асноўны інфармацыйны патэнцыял па тэме ўключаюць дакументы саміх палітычных партый і арганізацый: праграмныя заявы, статуты мясцовых арганізацый, іх справаздачныя дакументы, перапіска, улёткі і некаторыя іншыя віды дакументаў. У комплексе гэтых крыніц прасочваецца пазіцыя партый і палітычных арганізацый па ідэалагічных, палітычных, тактычных і арганізацыйных пытаннях, выяўляецца спектр меркаванняў у колах іх прадстаўнікоў, эвалюцыя партыйных тэорыі і практыкі пад уздзеяннем штодзённых абставін.

Раскрыць ідэйную тэарэтычную аснову розных палітычных арганізацый дапамагае перыёдыка. Перыядычны друк з'яўляўся адным са сродкаў аператыўнай абвесткі насельніцтва аб палітычных падзеях. Ён, відавочна, меў розную ідэалагічную скіраванасць, з прычыны чаго падаваў інфармацыю пад пэўным вуглом. Крыніцазнаўцамі агульнапрызнана спецыфічная ўласцівасць перыёдыкі – шматпланавасць. Гэта сінтэтычны матэрыял, які ўключае ў сябе самую разнастайную па жанры, паходжанні і характары інфармацыю: афіцыйныя паведамленні і дакументы, заканадаўчыя акты, публіцыстыку, лісты, хроніку, разнастайную газетную інфармацыю (нататкі-справаздачы, рэпартажы, інтэрв'ю), аб'явы. Партыйная прэса асвятляла пераважна ўдзел палітычных партый у перадвыбарных кампаніях, мітынгах і сходах, змест партыйных дакументаў, палеміку палітычных аб'яднанняў, выпуск друкаваных агітацыйных матэрыялаў, сувязь з іншымі арганізацыямі, судовыя разбіральніцтвы па палітычных справах. Афіцыйныя выданні, наадварот, змяшчалі паведамленні спакойнага або нейтральнага характару. Тым не менш у іх была агульная задача – паўплываць на масы, прыцягнуць іх на свой бок. Увогуле, Маніфест 17 кастрычніка 1905 г. спарадзіў да жыцця вялізную колькасць перыядычных выданняў. Праўда, іх грамадскае самавызначэнне якраз і звязана з узнікненнем легальных палітычных партый. На тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў распаўсюджваліся агульнарасійскія і рэгіянальныя газеты і часопісы («Правительственный вестник», «Русскнй вестник», «Речь», «Крестьяннн», «Труд», «Борьба», «Новая жизнь», «Губернские ведомостн» н «Епархиальные ведомости», «Северо-западная жизнь», «Белорусская жизнь», «Мннская речь», «Северо-Западный край», «Голос провинцнн», «Окраина», «Жнзнь провинцни», «Минский курьер», «Витебский голос», «Kraj»). Вядзенне паміж перыядычнымі выданнямі рознага кірунку дыскусій і палемікі – каштоўнейшы фундамент для аналітычных заключэнняў спецыфікі палітычнай барацьбы «на месцах». Асобна патрэбна адзначыць сатырычныя выданні. Хаця яны не выходзілі на дадзенай тэрыторыі, але былі шырокавядомыя і папулярныя («Зрнтель», «Голос жизни», «Пулемет», «Жало» і др.), бо на іх старонках падзеі ў краі атрымлівалі пэўны рэзананс.

Дапамагаюць у разуменні ўнутранай атмасферы рэвалюцыйных пераўтварэнняў матэрыялы асабістага паходжання[1]. Нягледзячы на тое што мемуары і ўспаміны гэтага часу, бывала, мелі заказны характар, толькі яны ўтрымліваюць прыватную, дробную інфармацыю. Крытычны падыход да зместу і супастаўленне з іншымі дакументамі дазваляе эфектыўна прымяняць іх у працы.

***Кансалідацыя нацыянальных рухаў.*** Паўстанне 1863–1864 гг. і рэвалюцыйныя падзеі пачатку XX ст. спрыялі кансалідацыі нацыянальных рухаў, узмацнілі іх змест. На авансцэне палітычнага жыцця краю існавалі «польскае», «яўрэйскае» і «беларускае» пытанні. Прыярытэтнымі групамі крыніц па гісторыі дадзеных пытанняў з'яўляюцца дакументы, якія ўтварыліся ў выніку дзейнасці органаў расійскай улады, а таксама дакументальныя матэрыялы розных грамадскіх сіл мясцовага паходжання. Сюды ж варта аднесці матэрыялы перыядычнага друку і брашуры агітацыйна-публіцыстычнага характару.

Дакументы, створаныя ў выніку дзейнасці дзяржаўных інстытутаў і канкрэтных асоб, якія займалі пэўныя дзяржаўныя пасады, даюць адказ на пытанне, што менавіта разумелі расійскія ўлады пад «польскім», «яўрэйскім» і «беларускім» пытаннямі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Дакументы і матэрыялы (у тым ліку і ўспаміны) паўстанцаў 1863 г., народнікаў і прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху пачатку XX ст. адлюстроўваюць эвалюцыю зместу тэрмінаў, звязаных з нацыянальнымі аспектамі, разуменні прадстаўнікоў мясцовай эліты. Рознага кшталту публіцыстычныя матэрыялы характарызуюць ідэалагічнае забеспячэнне палітычнага працэсу, які праходзіў на беларускіх тэрыторыях у адзначаны час.

Асаблівасці нацыянальнага яўрэйскага руху, цесна спалучанага з грамадска-палітычным, абумовілі неабходнасць аналізу дакументаў па гісторыі Бунда[2] для рэканструкцыі палітычнай платформы большасці яўрэйскіх сацыялістычных партый, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі. Грунтоўныя дакументальныя зборы па гісторыі беларускіх яўрэяў змяшчае электронны рэсурс Музея гісторыі польскіх яўрэяў[3]. Тут ёсць дастаткова шмат дакументальных матэрыялаў, датычных жыцця і дзейнасці найбольш выбітных асоб беларускага яўрэйства, а таксама статыстычныя матэрыялы. Усе яны ў асноўным ілюструюць адносіны яўрэйскага насельніцтва і мясцовай расійскай адміністрацыі.

---

[1] Из архива С. Ю. Витте. Воспоминаиия. – СПб., 2003. – Т. 2 : Рукописные заметки; Симончик Ф. В. В огне трех революций : воспоминания старого коммуниста. – Минск, 1964; Шкловский Г. Л. Бобруйск накануне 1905 // 1905 год в Белоруссии : сборник статей, воспомииаиий и материалов. – Минск, 1925; Белеиький Е. К истории Мииской организации РСДРП в 1903–1905 гг. // Там же; Кизеветтер Е. Я. Революция 1905–1907 гг. глазами кадетов (Из дневииков). – URL: http://www.runivers.ru/new_htmlreader/?book=5609&chapter=84215; Цеханович И. О. Записки деда для внука о своих предках. – Минск, 2005.

[2] Бунд в Беларуси (1897–1921) : док. и материалы. – Минск, 1997.

[3] Museum Historii Żydów Polskich. – URL: http://www.sztetl.org.pl.

Прасачыць кантэкст беларускага нацыянальнага руху магчыма на базе крыніц публіцыстычнага і перыядычнага характару. Галоўным рупарам, відавочна, выступае «Наша Ніва». Рэдакцыйны архіў «Нашай Нівы» пасля падзелу выглядае наступным чынам: у Беларусі (БДАМЛМ, фонд 3) знаходзіцца тая частка, якую ўмоўна можна назваць «ніжэйшым архівам» (у асноўным ліставанне карэспандэнтаў газеты, допісы з месцаў літаратурнага і побытавага характару, этнаграфічныя замалёўкі і г. д.); у Вільні ў аддзеле рукапісаў акадэмічнай бібліятэкі (АР БАНЛР, фонд 21) захоўваецца «вышэйшы архіў» (дакументы кіраўнікоў беларускага руху, палітыкаў, галоўных публіцыстаў і літаратараў – братоў Івана і Антона Луцкевічаў, Аляксандра Уласава, Вацлава Ластоўскага, Францішка Аляхновіча, Аркадзя Смоліча, Браніслава Эпімах-Шыпілы і інш.). Віленская частка архіва ўтрымлівае таксама крыніцы, датычныя ўзаемаадносін у асяродку віленскай інтэлігенцыі па лініях «краёўцы–нашаніўцы», беларусы–палякі–літоўцы, фінансаванне беларускага руху, асноўныя ідэйныя рукапісы.

Умоўна размеркаванне крыніц паміж беларускімі і літоўскімі архівамі можна падзяліць па лініі: дакументы сацыяльнай базы руху і дакументы кіруючых цэнтраў адпаведна. Хоць, яшчэ раз паўторымся, гэта абагульненая карціна. Безумоўна, сустракаюцца выключэнні, якія, аднак, толькі пацвярджаюць правіла. Толькі на падставе аналізу гэтых дзвюх частак архіва «Нашай Нівы» можна бачыць станаўленне беларускага руху больш-менш цэласна.

Такім чынам, інфармацыйны патэнцыял гістарычных крыніц, уведзеных у навуковы зварот, дазваляе правесці глыбокі аналіз палітычных працэсаў на беларуска-літоўскіх землях падчас уваходжання іх у склад Расійскай імперыі. Галоўная частка крыніц сканцэнтравана пераважна ў дзяржаўных архівах Беларусі, Літвы і Расіі і падзяляецца на справаводчыя матэрыялы адміністрацыйных устаноў улады, як цэнтральных урадавых органаў кіравання, так і мясцовых, і заканадаўчыя акты. Важнымі крыніцамі з'яўляюцца дакументы прыватнага паходжання, успаміны ці мемуары асоб, якія займалі пасады ў сістэме кіравання ці іншым чынам садзейнічалі прыняццю пэўных рашэнняў па шматлікіх аспектах унутранай палітыкі імперыі, таксама ўспаміны ўдзельнікаў ваенных канфліктаў, грамадска-палітычных рухаў. Спецыфіка палітычнай гісторыі надае асаблівае значэнне гістарычным крыніцам публіцыстычнага характару, перыёдыцы і праграмным дакументам розных арганізацый. Інфарматыўнасць вылучаных дакументаў дазваляе правесці комплексны аналіз агульнапалітычнай сітуацыі і яе праяўлення ў рэгіёнах як маналітнага і ўзаемазвязанага працэсу, а тым самым верыфікаваць апублікаваныя крыніцы з архіваў Расіі, Літвы, Польшчы; канкрэтызаваць асаблівасці падзей на ўзроўні губерні, павета, воласці; акрэсліць адносіны грамадства да рэалій і знайсці ў палітычным кантэксце месца і ролю асобнага чалавека.